# Адкрываюць новыя спецыяльнасці

**Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Куляшова заўсёды імкнецца ісці ў нагу з часам. Тут пільна сочаць за развіццём рынку працы і стараюцца адкрываць новыя спецыяльнасці, запатрабаваныя ў рэгіёне. Сёлета ва ўніверсітэце таксама плануюць абнавіць пералік прапанаваных для навучання прафесій.**

— Універсітэт не стаіць на месцы, пастаянна развіваецца, адкрывае для сябе новыя напрамкі ў адукацыі і навуцы. Так, у 2020 годзе на факультэце матэматыкі і прыродазнаўства будзе адкрыты набор студэнтаў на дзве новыя спецыяльнасці: "Медыка-біялагічная справа" і "Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій", — расказаў прарэктар па вучэбнай рабоце ўніверсітэта А.В.Дзьячэнка.

Па яго словах, ажыццявіўшы навучанне па спецыяльнасці "Медыка-біялагічная справа", студэнт атрымае кваліфікацыю "біёлаг-аналітык; выкладчык біялогіі". Спецыяльнасць "Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій" дазволіць маладым людзям стаць інжынерамі-праграмістамі. Дарэчы, на інжынерную спецыяльнасць набор у МДУ імя А.А.Куляшова будзе праводзіцца ўпершыню.

Абедзве спецыяльнасці зараз вельмі запатрабаваныя на рэгіянальным рынку працы. Тэрмін навучання па іх на дзённай форме — чатыры гады.